*Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 52 (66) | Серада, 31 кастрычніка 1945 г.

## Па-большэвіцку рыхтавацца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР

10 лютага 1946 года ўсе грамадзяне нашай краіны, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні будуць удзельнічаць у выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР.

Працоўныя совецкай Радзімы ідуць да выбараў з гордасцю і радасцю, з свядомасцю таго, што пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна, яны адстаялі вялікія заваяванні соцыялістычнай рэволюцыі, адстаялі самую дэмакратычную ў свеце Сталінскую Канстытуцыю, якая забяспечвае для чалавека права на працу, на адпачынак, на асвету, свабоду слова, сходаў, друку, аднолькавыя правы ўсіх нацыянальнасцей, раўнапраўе жанчын з мужчынамі.

Працоўныя нашага раёна з вялікім задавальненнем рыхтуюцца да выбараў вышэйшага органа дзяржаўнай улады. Ва ўсіх вёсках падабраны агітатары, якія сярод насельніцтва вывучаюць „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ і Сталінскую Канстытуцыю. 10 агітатараў працуе і ў райпромкамбінаце.

Але гэта яшчэ пачатак той вялікай работы, якую трэба правесці ў час падрыхтоўкі да выбараў. У перыяд падрыхтоўкі да выбараў перад партыйнымі і совецкімі арганізацыямі стаяць адказныя задачы. Патрэбна давесці да свядомасці працоўных выбарчы закон, вывучыць Сталінскую Канстытуцыю, Сельскім советам патрэбна падрыхтаваць выбарчыя ўчасткі, правільна скласці спісы выбаршчыкаў.

З вялікай цікавасцю выбаршчыкі будуць слухаць агітатараў, якія будуць расказваць аб ратных подзвігах Чырвонай Арміі, аб працоўным гераізме совецкага тыла, аб ролі нашай большэвіцкай партыі ў арганізацыі перамогі над ворагам.

Палітычная работа сярод выбаршчыкаў павінна быць масавай, дзейснай. Яе трэба весці паўсядзённа. У час падрыхтоўкі да выбараў трэба, каб рашуча была палепшана работа агіткалектываў, хат-чытален.

Працоўныя нашага раёна, як увесь совецкі народ, з вялікім задавальненнем будуць рыхтавацца да выбараў. З новымі поспехамі, яшчэ больш згуртаваныя вакол большэвіцкай партыі, вакол вялікага Сталіна, прыдуць яны да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

## ПЛАКАТЫ І ЛОЗУНГІ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ВЫБАРАМ

Дзяржаўнае выдавецтва Беларускай ССР выпускае масавым тыражом серыю плакатаў і лозунгаў, прысвечаных выбарам у Вярхоўны Совет СССР. Вышаў з друку масавы плакат „Пісьмо беларускага народа Генералісімусу Совецкага Саюза таварышу Сталіну у дзень першай гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў“.

## ВЫБАРЧЫ ЗАКОН— У МАСЫ

### СХОД ДЫРЭКТАРАЎ І ЗАГАДЧЫКАЎ ШКОЛ

28 кастрычніка адбыўся сход дырэктараў і загадчыкаў школ раёна па пытанню падрыхтоўкі да выбараў ў Вярхоўны Совет СССР. Даклад па гэтаму пытанню зрабіў загадчык прапаганды і агітацыі райкома КП (б) Б т. Цуркан.

Настаўнікі абмяняліся вопытам сваей работы сярод насельніцтва па вывучэнню „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“.

### У КОЖНАЙ ВЁСЦЫ ПРАЦУЮЦЬ АГІТАТАРЫ

Пачатося вывучэнне „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ сярод выбаршчыкаў Дзераўноўскага сельсовета. У кожнай вёсцы працуе па пяць агітатараў. У склад агітатараў увайшоў лепшы актыў сельсовета і настаўнікі.

## НАСУСТРАЧ 28-й ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІКА

### ВЫКОНВАЮЦЬ ГРАШОВЫЯ ПЛАЦЯЖЫ

Рыхтуючы дастойную сустрэчу 28-й гадавіне Кастрычніка, сяляне Дзераўноўскага сельсовета разлічваюцца з дзяржавай па грашовых плацяжах чацвертага квартала.

Поўнасцю выканалі грашовыя плацяжы за чацверты квартал сяляне вёскі Дзераўная. Нікалай Гарост, Нікалай Галуц, Ігнат Хаміч, Федосій Калінкевіч. За імі следуюць і другія сяляне. За два тыдні з гэтай вёскі за чацверты квартал паступіла 16.300 рублёў.

Н. Валасевіч.

### АСЕННЯЯ ПАСАДКА ДРЭЎ

У раённым цэнтры пачалася асенняя пасадка дрэў. Да 28-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі будуць высаджаны дрэвы па ўсіх вуліцах горада.

На правядзенне азелянення вуліц комунальнаму аддзелу адпушчана 30 тысяч рублёў.

# Хутчэй завяршыць пастаўку збожжа і бульбы дзяржаве!

## ЗВОДКА

**Аб ходзе выканання паставак збожжа і бульбы дзяржаве на 29 кастрычніка.**

| №№ п/п. | Назва сельсоветаў | Проц. выканання па хлебу. | Проц. выканання па бульбе. |
|---|---|---|---|
| 1 | Акцябрскі | 103,0 | 62,0 |
| 2 | Аніскавіцкі | 101,2 | 19,0 |
| 3 | Дзеткавіцкі | 98,9 | 7,0 |
| 4 | Худлінскі | 96,7 | 30,0 |
| 5 | Дзямідавіцкі | 89,9 | 52,0 |
| 6 | Першамайскі | 88,6 | 22,0 |
| 7 | Антопальскі | 85,5 | 53,0 |
| 8 | Заніўеўскі | 80,6 | 42,0 |
| 9 | Асіпавіцкі | 79,5 | 51,0 |
| 10 | Галоўчыцкі | 79,3 | 41,0 |
| 11 | Іlаўскі | 73,4 | 6,0 |
| 12 | Гарадзецкі | 71,4 | 39,0 |
| 13 | Каменскі | 68,6 | 53,0 |
| 14 | Дзераўноўскі | 48,0 | 16,0 |

На раёну: 84,0 36,0

## РАЗЛІЧЫЛІСЯ ПА ЎСІХ ВІДАХ ПАСТАВАК

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, многія сялянскія гаспадаркі Антопаля дастойнымі справамі сустракаюць 28 гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі. Гаспадарка ўпаўнаважанага горсовета Ярошчыка Міхаіла поўнасцю разлічылася з дзяржавай па хлеба-і бульбапастаўках, здала 50 кілограм мяса, выканала малакопастаўкі. Сям'я дэмабілізаванага Фезанція Невядомскага была вызвалена ад хлебапаставак. Але вярнуўшыся з Чырвонай Арміі т. Невядомскі здаў у фонд Перамогі 125 кілограм збожжа, 330 кілограм бульбы.

Поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах паставак чырвонаармейская сям'я Чатырбок А., селянін Півень Васілій і другія.

А. Стасевіч.

## ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

Наркамат сярэдняга машынабудаўніцтва СССР прыступае да арганізацыі ў Кіеве матацыклетнага завода. Першую партыю машын завод выпусціць у будучым годзе.

* *

Ва ўсіх абласцях Беларусі створачы інстытуты павышэння ведаў настаўнікаў. У іх павышаюць свае веды 40 тысяч чалавек. Звыш 8 тысяч настаўнікаў навучаюцца ў завочных педагагічных інстытутах і вучылішчах рэспублікі.

(ТАСС).



У племянным соўгасе „Караваево" Кастромскай вобласці выведзена новая парода высокапрадуктыўнай буйнай рагатай жывёлы, якая мае вялікае дзяржаўнае значэнне.

На здымку: кастрамская карова „Касета". Жывая вага яе 620 кілограм. За чацвертую лактацыю яна дала 9205 літраў малака.

Фота М. Каралёва. Фотахроніка ТАСС.

# ПЛАН

## падрыхтоўкі і правядзення 28-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі

Раённая камісія па падрыхтоўцы і правядзенню свята 28-й гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі пастанавіла:

1. 3 лістапада склікаць кіраўнікоў прадпрыемстваў і устаноў па пытанню афармлення і ачысткі горада (адказныя за правядзенне старшыня горсовета т. Стасевіч і намеснік начальніка міліцыі т. Шаршнёў).
2. Да 6 лістапада афарміць усе прадпрыемствы, установы, сельскія советы лозунгамі, плакатамі, партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада, флагамі, зелянню (адказныя за арганізацыю т. т. Стасевіч, Косцікаў, старшыні сельскіх советаў).
3. З 1 па 6 лістапада правесці гутаркі па прадпрыемствах, установах і сярод насельніцтва горада і вёсак раёна аб 28-й гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі. (Праводзяць агітатары).
4. 1 лістапада правесці інструктаж агітатараў па пытанню правядзення гутарак сярод насельніцтва аб 28-й гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі (адказны т. Цуркан).
5. Выдучыць дакладчыкаў па правядзенню дакладаў аб 28-й гадавіне Кастрычніка ў сельскіх советах раёна і правесці з імі інструктыўны даклад (адказны т. Цуркан).
6. 6 лістапада ў горадзе і сельскіх советах правесці ўрачыстыя пасяджэнні выканкомаў советаў дэпутатаў працоўных, сумесна з партыйнымі, комсамольскімі і грамадскімі арганізацыямі, прысвечаныя 28-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.
7. 7 лістапада правесці мітынгі ў г. Антопале і м. Гарадцэ (адказныя за правядзенне т. т. Царыкаў, Белкіна).
8. 7 лістапада арганізаваць дзецкія ўграннікі ў школах, дзетсаду, дзецдоме (адказныя т. т. Балдыкаў, Салановіч).
9. З 1 па 6 лістапада арганізаваць збор падарункаў для дзяцей-сірот Гарадзецкага дзетдома (адказныя т. т. Балдыкаў, Салановіч).
10. Выпусціць спецыяльныя святочныя нумары насценных газет на прадпрыемствах, установах, хата-чытальнях, сельскіх советах (адказны т. Спірыдонаў).

**Камісія па падрыхтоўцы і правядзенню 28-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.**

В. а. рэдактара П. СПІРЫДОНАЎ

Рэдакцыі раённай газеты „Перамога" патрабуюцца: машыністка, вучні-наборшчыкі, вартаўнік.

ГЛ 14873 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.